■ Кінакрокі

## Ігар ПОРШНЕЎ:

# «НЯМА ТАКОГА РЭЖЫСЁРА, ЯКІ НЕ ПРЭТЭНДУЕ НА ОСКАР»

**Калі яшчэ нядаўна з «Беларусьфільма» рэдка прыходзілі навіны пра здымкі ігравога кіно, то апошнім часам яны з'яўляюцца адна за другой — пра баявік, серыялы, фільм Дзмітрыя Астрахана і іншае. Таму, калі мы прыйшлі да дырэктара нацыянальнай кінастудыі Ігара ПОРШНЕВА на інтэрв'ю, перш за ўсё запыталіся аб прычынах такога «буму».**

— З моманту, калі ў верасні 2015 года я заняў пасаду дырэктара кінастудыі, да жніўня 2016-га не прайшло ніводнага конкурсу кінапраектаў Міністэрства культуры, а бюджэтныя сродкі мы можам атрымаць толькі праз яго. У гэты час мы завяршалі дзве ігравыя карціны, мультстудыя была больш-менш загружана, затое студыя дакументальнага кіно «Летапіс» аказалася на мяжы выжывання, мы тут нават рэкламу здымалі. Нарэшце, у конкурсе 2016 года мы перамаглі ў пэўнай колькасці намінацый і запусцілі праекты ў работу, таму цяпер у вытворчасці знаходзіцца адразу шэсць ігравых карцін. Мяне радуе, што кінастудыя загружана, праўда, лепш было б, каб працэс здымак быў рытмічным, бо нашы тэхнічныя магчымасці не бясконцыя, тым больш што «Беларусьфільм» знаходзіцца ў завяршальнай стадыі рэканструкцыі. Прыходзіцца пераразмяркоўваць кіназдымачнае, асвятляльнае і гукавое абсталяванне, дзяліць мантажныя кабінеты. Але ўсё адно групы працуюць з вялікім энтузіязмам, я думаю, у наступным годзе ў нашага маркетынгавага аддзела будзе шмат працы па рэалізацыі створанага.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**«Зараз мы тэрмінова выконваем даручэнне Міністэрства культуры і кіраўніка дзяржавы — здымаем восем кароткаметражных фільмаў пра лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі».**

***— Раскажыце пра ігравыя фільмы, якія знаходзяцца ў здымачным перыядзе.***

— Адзін з іх — працяг тэлесерыяла «Ой, ма-мач-кі», што з поспехам прайшоў на расійскіх каналах і нядаўна быў паказаны на нашым тэлебачанні. Восенню група павінна завяршыць здымкі, распачаць мантажна-таніровачны перыяд і ў гэтым жа годзе здаць серыял. Гэта камерцыйны праект, мы будзем рэалізоўваць яго на расійскім рынку і раздзічваем зарабіць. Фільм Дзмітрыя Астрахана «Жыццё пасля жыцця» — першая за шмат гадоў паўнавартасная сумесная работа нашага Міністэрства культуры і Міністэрства культуры Расійскай Федэрацыі. Цікавая карціна з прыцягненнем расійскіх зорак і вялікай колькасцю нашых акцёраў. Цяпер актыўна ідуць здымкі, мы зробім чатырохсерыйную версію для тэлеэкрана і поўнаметражны фільм для кінаэкранаў Беларусі і Расіі. У такім жа двайным фармаце, дарэчы, выйдзе жорсткі баявік «Чорны сабака», здымкі якога мы скончылі паўтара месяца таму. Таксама запусціўся мастацкі кіраўнік «Беларусьфільма» Вячаслаў Нікіфараў з фільмам «Тум-пабі-дум» — вельмі цікавай работай «для сямейнага прагляду» пра хлопчыка з дзіцячага дома, здымалі ў сапраўдным дзіцячым доме. Мы з нецярпеннем чакаем карціну і разлічваем, што яна прыме ўдзел у кінафестывалі «Лістапад». Спадзяёмся, калі ўсе даручэнні кіраўніка дзяржавы будуць выкананы і ў лістападзе ён наведае «Беларусьфільм», каб «прыняць» завершаную рэканструкцыю кінастудыі, мы зможам паказаць «Тум-пабі-дум» першай асобе. Апроч іншага, «Беларусьфільм» запусціў прыгодніцкую карціну «Прынцэса і тыгр» Ігара Чацверыкова пра падлеткаў, якія шукаюць скарб у Нясвіжскім замку, і падрыхтаваў першы за доўгія гады зборнік дэбютных работ маладых рэжысёраў «Мы». Альманах складаецца з пяці кароткаметражак розных жанраў ад камедыі да драмы, яго мы таксама хочам аддаць на «Лістапад». Спадзяёмся, ён пройдзе і ў пракаце. Пры жаданні зборнік можна раскласці на асобныя фільмы, з якімі аўтары могуць удзельнічаць у кінафестывалях.

***— Здымкі альманаха «Мы», як тая разумею, былі праведзены не за бюджэтныя грошы?***

— Сто працэнтаў бюджэтнага фінансавання. З дзесяці, нават больш, прэтэндэнтаў спецыяльная камісія выбрала пяць рэжысёраў. Можа, атрымаецца кожны год рабіць такія зборнікі, паглядзім, як ён пройдзе ў пракаце.

***— Калі вы здаяце фільм «Чорны сабака» і пра што гэты баявік?***

— Мы здадзім яго да канца года, карціна робіцца з прыцэлам на расійскія тэлеканалы, таму што яны больш плацежаздольныя, у фільме закранаецца і сірыйская праблема. «Чорны сабака» заснаваны на кнізе Мікалая Чаргінца, у яго ёсць моцныя дэтэктыўныя раманы. Не буду раскрываць гісторыю, скажу толькі, што тут добрыя артысты і здымачная група.

***— А не страшна брацца за такі складаны жанр?***

— Тут выдатны склад здымачнай групы і вельмі добрая літаратурная аснова. Калі ёсць добрая літаратурная аснова, не страшна, можна за ўсё брацца. Баявік — папулярны мужчынскі запатрабаваны жанр, у якім наш партнёр Глеб Шпрыгаў мае вялізны вопыт працы. Цяпер, калі ў нас ужо ёсць чарнавы мантаж, я бачу, што атрымліваецца дастаткова захапляльны фільм, высокай якасці матэрыял. Нашы магчымасці, піратэхнічныя і іншыя, — усё дастойна.

***— Гэта значыць, што ў «Беларусьфільма» добры вопыт стварэння баевікоў? Яны акупаюцца?***

— Не, якраз вопыт сумны. У мяне ляжыць апошні фільм серыі «Дзяржаўная граніца», які мы можам рэалізаваць толькі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Я не магу прадаць яго ў Расіі, ужо колькі высілкаў патрацiў на спробы, але адказ адзін: гэта пра вашу беларускую граніцу, вось калі б вы знялі пра савецкую...

***— Як тады пад расійскі рынак адаптаваны «Чорны сабака»?***

— А там невыразнае месца дзеяння — не Беларусь і не Расія. Проста спецвойскі і спецаперацыі. Вазьміце любы замежны фільм: у героя чорная форма, яго закідваюць на заданне і чыноўнік кажа «калі з вамі нешта здарыцца, вы нас не ведаеце». Вельмі зручная пазіцыя.

***— Акцёрскі склад «Чорнага сабакі» — руска-беларускі?***

— Так, там нашы Павел Харланчук і Анатоль Кот, а ў галоўнай ролі Уладзімір Епіфанцаў.

***— А ў фільме Дзмітрыя Астрахана не будзе крэну, як часта здараецца ў сумесных руска-беларускіх праектах, у бок расійскіх акцёраў, якія іграюць у галоўных ролях, пакідаючы ўсе астатнія беларусам?***

— Складана сказаць. Гэта капрадукцыя, галоўную ролю выконвае Аляксандр Дамагараў, дзве жаночыя ролі — актрысы з Санкт-Пецярбурга і Масквы, а ўсе астатнія ў прынцыпе іграюць беларускія акцёры. Я не бачу тут ніякага перакосу. Як у мяне пытаюцца: «Вы што, не знайшлі ў Беларусі хлопчыка на галоўную ролю «Тум-пабі-дум»?» Тысячу дзяцей адглядзелі, але ж мы звярталі ўвагу не на нацыянальную прыналежнасць, у выніку выбралі найталенавіцейшага хлопчыка — проста фантастыка, што ён робіць, мы не можам на яго нарадавацца. Хлопчык з Адэсы, чым дрэнна? Мы гэтым хлопчыкам адкрываем для сябе ўкраінскі рынак, хоць і не наўмысна.

***— Што зараз з серыялам «Трымайся за аблокі»? Калі кінастудыя пачынала над ім працаваць, меркавалася, што ён выйдзе летам 2017-га.***

— Здымкі серыяла па розных прычынах знаходзіліся ў працяглай кансервацыі.

***— Па якіх прычынах?***

— Мы не паспелі зняць сур'ёзныя трукавыя сцэны, звязаныя з рыбацкай для жыцця, скончылася лета, а дзеянне серыі адбываецца летам, таму мы перанеслі здымкі. У гэтым годзе мы павінны ўсё скончыць, засталося зняць недзе 15—20 працэнтаў матэрыялу — прыкладна адну серыю з васьмі і кавалачкі некаторых сцэн. Работа не кінутая, не спісаная, яна існуе, зараз ідзе мантаж таго, што ўжо зроблена, і хутка серыял будзе гатовы.

**«Групы працуюць з вялікім энтузіязмам, я думаю, у наступным годзе ў нашага маркетынгавага аддзела будзе шмат працы па рэалізацыі створанага».**

***— Гэта значыць, затрымка менавіта тэхнічная і пытанняў да якасці матэрыялу не ўзнікала?***

— Тэхнічная — так, альбо хутчэй эканамічна-кліматычная. Грошы, што былі адпушчаны на серыял, не былі зрасходаваны, мы іх замарозілі і цяпер дастаём.

***— А што з дакументальным кіно?***

— Усё добра. Толькі выйшла некалькі карцін (у тым ліку «Агмень» Юрыя Цімафеева, «Янка Купала» Віктара Аслюка, «Першадрук» Ігара Чышчэні, «Чужое і сваё» Галіны Адамовіч, пра якія пісала «Звязда». — **Аўт.**), зараз мы тэрмінова выконваем даручэнне Міністэрства культуры і кіраўніка дзяржавы — здымаем восем кароткаметражных фільмаў пра лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі.

***— Гэтым займаецца Анатоль Алай?***

— Ён мастацкі кіраўнік. Зразумела, ён адзін не змог бы ўсё зрабіць, таму мы сабралі групу.

***— На гэта выдзелены нейкі асобны бюджэт?***

— Быў аб'яўлены спецыяльны конкурс, у якім удзельнічалі не толькі мы. Фільмы здымаюцца, адзін ужо здалі, да канца года павінны быць зроблены ўсе восем. Новую работу цяпер здымае Віктар Аслюк, называецца «Беларуская Атлантыда», Вольга Дашук — «Чалавека з фотаапаратам», Галіна Адамовіч — «Сівую легенду». Гэта значыць, будуць яшчэ цікавыя работы.

***— Нельга не заўважыць пераўтварэнні на «Беларусьфільме»: вы запрасілі ў каманду вядомага рэжысёра Вячаслава Нікіфарава і прадзюсара Юрыя Ігрушу, у кінастудыі з'явіўся прэс-сакратар, вы аддаяце належную ўвагу не толькі стварэнню кіно, але і яго прасоўванню. Гэта, можна сказаць, нешта новае.***

— Гэта не новае, вы проста забылі тую кінастудыю... Я ўсё жыццё тут правёў. Нарадзіўся на здымачнай пляцоўцы фільма «Гадзіннік спыніўся апоўначы», помню сябе ў аўтобусе на шляху ў экспедыцыю некуды ў Крым. Помню фільмы, на якіх працавалі мае бацькі, я заўсёды быў на пляцоўцы, калі вяртаўся са школы — пераходзіў вуліцу і ішоў на кінастудыю. Я вырас у гэтым асяроддзі і ведаю, што студыя заўсёды ганарылася сваімі работамі, яе запрашалі на міжнародныя кінафестывалі, сюды прыязджалі — мала хто ведае — італьянцы з намерам зняць «Альпійскую баладу» па Васілю Быкаву, якую ў выніку зняў Барыс Сцяпанаў. Такая была палітычная сітуацыя: калі італьянцы зацікавіліся, значыць, мы самі здымем. Лічу, атрымалася не самая дрэнная работа. У нашым музеі міжнародныя прызы найвышэйшага ўзроўню. Мы хочам адрадзіць той аўтарытэт, для гэтага мы павінны прысутнічаць на міжнародных кінафестывалях, наша маркетынгавая служба гэтым займаецца. Многія нават не ведаюць, што «Беларусьфільм» існуе, таму, калі ёсць дастойныя работы, мы іх адсылаем на фестывалі, дакументалістаў ведаюць больш, але самымі вядомымі з'яўляюцца нашы мультыплікатары. Мы хочам, каб тое ж самае было з ігравым кіно.

**«Мая пазіцыя ў тым, што трэба выслухаць кожнага і кожнаму даць магчымасць выказацца і прынесці сваю работу. Мы сустракаемся і з «ветэранамі», і з моладдзю».**

***— Перабудовы, пра якія я ўжо казала, ваша ўвага да маркетынгу, жаданне прасоўваць фільмы на кінафестывалі — даволі сімпатычны шлях. У той жа час, гледзячы на баявік альбо серыялы, якія зараз у рабоце, здаецца, што вы імкняцеся да тэлебачання і продажаў. Узнікае кантраст: вы хочаце ўліцца ў сусветную кінаіндустрыю, а праекты, што зараз у працы, гэтаму супярэчаць.***

— Ёсць яшчэ даручэнне кіраўніцтва, згодна з якім мы павінны быць не толькі ўтрыманцамі, але і зарабляць. Я з вамі не згодны: так, мы робім тэлесерыялы, але да іх ствараем і кінаварыянт. Фільм «Жыццё пасля жыцця», я думаю, будзе новай формай, вельмі цікавай гісторыяй і чыста фестывальным кіно. Дзмітрый Астрахан неадназова браў узнагароды за свае карціны. «Чорны сабака», менавіта поўнаметражны фільм, таксама можа ўдзельнічаць у кінафорумах, я ведаю шмат фестываляў, прысвечаных баевікам і ўсялякім паліцэйскім карцінам. Зборнік дэбютных работ — гэта, лічыце, пяць кароткаметражных фільмаў, якія ў прынцыпе накіраваны на тое, каб удзельнічаць у форумах. Напэўна, трыста фестываляў я ведаю, куды можна рассылаць заяўкі, і калі з пяці навел адберуць адну, гэта ўжо будзе поспехам. Мы думаем, «Прынцэса і тыгр» таксама будзе дастойнай работай, толькі на тэрыторыі СНД ёсць чатыры альбо пяць фестываляў фільмаў для дзяцей і юнакоў. «Тум-пабі-дум», я думаю, Вячаслаў Нікіфараў зробіць фестывальным, гэта не будзе прахаднай карцінай, яна скажа нешта новае ў кінематографе. Ёсць прыказка: няма такога радавога, які не марыць стаць генералам. Дык вось, няма такога рэжысёра, які не прэтэндуе на Оскар.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.** katsyalovich@zviazda.by

*Поўную версію інтэрв'ю чытайце на сайце zviazda.by*